**ВАСІЛЬЕЎКА**, археалагічны помнік — курганны могільнік каля в. Васільеўка Круглянскага р-на Магілёўскай вобл. Размешчаны на выгане ўздоўж правага берага р. Друць, за 0,1 км на У ад вёскі. Цяпер мае 23 насыпы выш. 1—2,3 м, дыям. 6—12 м. Адкрыў у 1930 А.Дз.Каваленя і налічыў 83 курганы. Адзін быў раскапаны. У ім выяўлена трупаспаленне на вогнішчы з некалькімі невыразнымі фр-тамі керамікі. У 1977 і 1989 могільнік абследаваў В.Ф.Капыцін. У 1992—93 Я.Р.Рыер даследаваў 5 курганоў. 4 з іх утрымлівалі трупаспаленні па-за насыпамі, 1 — у насыпе. Прасочаны значныя пласты попелу, у адным з курганоў — да 1,8 м таўшчыні. Сярод знаходак — жал. нажы, упрыгажэнні (бронзавыя скроневыя кольцы, бранзалеты, пярсцёнкі), шмат керамікі, зробленай на ганчарным крузе. Інвентар датуе пахаванні к. 10 — пач. 12 ст. У адным з курганоў знойдзена грубаляпная кераміка сяр. 1-га тыс., якая паходзіць, верагодна, з паселішча тых часоў, аб наяўнасці якога сведчыў А.Дз.Каваленя.

*Літ.*: К а в а л е н я А.Дз. Археалагічныя росшукі ў вярхоўях рэк Друці, Усяж-Бук і Лукомкі // Працы. Т. 3; К о п ы т и н В.Ф. Археологические памятники Круглянского района Могилевской области. Могилев, 1991.

*Я.Р.Рыер.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова